*Святлана Вяргеенка*

# ТЭМА «ЗАМОВЫ» Ў СІСТЭМЕ ВЫКЛАДАННЯ ФАЛЬКЛОРНЫХ ЖАНРАЎ

Вучэбнай праграмай па дысцыпліне «Фальклярыстыка» прадугледжаны гадзіны на знаёмства студэнтаў-філолагаў з тэмай «Замовы». Лекцыйныя і практычныя заняткі, прысвечаныя гэтай тэме, дапамагаюць студэнтам атрымаць інфармацыю па замовах, якія яднаюць магію слова і магію дзеяння, пазнаёміцца з гістарыяграфіяй замоўнага жанру, а таксама навучыцца аналізаваць магічныя тэксты, прымяняючы сучасныя распрацоўкі не толькі беларускіх, але і замежных, у першую чаргу расійскіх, вучоных. У пачатку лекцыі вельмі важна засяродзіць увагу на гісторыі збірання і вывучэння твораў замоўнага жанру. Слова лектара можа суправаджацца дэманстрацыяй копій некаторых рэдкіх выданняў дакастрычніцкай эпохі, у якіх прадстаўлены тэксты замоў розных функцыянальна-тэматычных груп. Сярод найбольш значных назавем «Беларускі зборнік» (вып. 5) Е. Раманава [5], «Материалы для изучения быта и языка русского населения северо-западного края: в 3-х т.» П. Шэйна [6], «Пережитки древняго миросозерцания у белоруссовъ: этнографический очерк» А. Багдановіча [2], «Заговоры, заклинания, обереги и другие виды народного врачевания, основанные на вере в силу слова. (Из истории мысли)» А. Ветухава [4], «Смоленский этнографический сборник» У. Дабравольскага і інш. Наяўнасць ілюстрацыйнага матэрыялу па гістарыяграфіі замоў, пытанню, якое з’яўляецца не самым «удзячным» для ўспрымання, садзейнічае актывізацыі ўвагі студэнтаў, а ў выніку – лепшаму разуменню і запамінанню неабходных звестак, бо ў працэс уключаецца не толькі слыхавая, але і зрокавая памяць. У той жа час параўнанне дакастрычніцкіх запісаў твораў замоўнага жанру з сучаснымі, зробленымі ў тым ліку і студэнтамі падчас палявых фальклорных экспедыцый, дазваляе зацікавіць першакурснікаў збіральніцай працай, усвядоміць неабходнасць якаснага выканання дадзенага віду работы. Выкладчык засяроджвае ўвагу студэнтаў непасрэдна на пытаннях збору фактычнага матэрыялу ад інфармантаў, людзей сталага ўзросту, сярод якіх сустракаюцца і носьбіты практычных навыкаў выкарыстання магічных тэкстаў (так званыя «бабкі-шаптухі»).

Асаблівасцю прапанаванай лекцыйнай тэмы з’яўляецца тое, што многія тэарэтычныя палажэнні, звязаныя з замоўным жанрам, дакладна не выпрацаваны. Напрыклад, пры вызначэнні жанру, вырашэнні пытання класіфікацыі замоў выкладчык прапануе меркаванні розных вучоных: Г. Барташэвіч, К. Кабашнікава, М. Грынблата, П. Ахрыменкі і інш. Тым не менш, пры ўсёй шматварыянтнасці поглядаў, існуюць палажэнні, якія прымаюцца як класічныя. Так, за аснову можна прыняць класіфікацыю Г. Барташэвіч, згодна з якой творы замоўнага жанру падзяляюцца на «І. Замовы гаспадарчага характару, куды ўваходзяць замовы пры паляванні, пры лоўлі рыбы, пры развядзенні пчол, пры сельскагаспадарчых работах

(«звароты да ніўкі»), пры першым выгане жывёлы на пашу, для захавання статку, пры пажары, пры пабудове хаты. II. Ахоўныя замовы ад злых духаў і шкодных істот, прыродных з'яў: ад перуна, ад дамавога, ад хлеўніка, ад лесавіка, ад ведзьмы, чараўнікоў, ад залому, ад нячыстай сілы, «нарадкі», «стацця», «падвею». III. Ахоўныя замовы ад звяроў: ад гадзюкі, ад ваўкоў, сабакі, ад шалу. IV. Замовы ад хвароб, куды ўваходзяць таксама прафілактычныя, звязаныя з родамі. V. Любоўныя замовы ўключаюць прысушкі і адсушкі. VI. Замовы сацыяльнага зместу (ад несправядлівага суда, салдацкія, ад «урагоў»)» [1, *15–16*].

Сярод тэарэтычных пытанняў, якія выносяцца на лекцыю, важна разгледзець і пытанне, звязанае з распрацоўкай катэгорыі матыву ў замоўным жанры. Як і іншыя фальклорныя жанры, замовы сфарміравалі ўласцівы для іх фонд матываў, без вывучэння якога немагчыма вызначыць сюжэтны склад замоў. Феномен замоў заключаецца ў іх ярка выражанай міфапаэтычнай светапогляднай прыродзе, спалучанасці з актуальнай функцыянальнай прагматыкай. Структурна-функцыянальны аспект даследавання замоўных матываў дазваляе больш глыбока асэнсаваць занатаваныя ў замовах міфалагічныя ўяўленні беларусаў пра навакольны свет. Пры знаёмстве студэнтаў з праблематыкай матыву ў замоўным жанры ў першую чаргу неабходна звярнуць увагу на стан распрацаванасці пытання ў фалькларыстыцы, адзначыўшы, што пэўныя крокі ў гэтым напрамку былі зроблены як беларускімі, так і расійскімі вучонымі. Аналіз фалькларыстычных даследаванняў расійскіх вучоных дазволіў вылучыць тры асноўныя канцэпцыі асэнсавання паняцця «матыў». 1. С. Няклюдаў, Т. Агапкіна, Б. Пуцілаў трактуюць матыў як сюжэтаўтваральную адзінку. 2. На аснове аналізу прац вядомых расійскіх і замежных вучоных (А. Весялоўскага, С. Няклюдава, С. Томпсана, А. Дандэса, Л. Парпулавай) Б. Пуцілаў абгрунтаваў функцыю матыву ва ўтварэнні структуры фальклорнага тэксту. 3. Матыў разглядаецца і з пункту гледжання яго структуры: вылучаюцца такія структурныя кампаненты як суб'ект, прэдыкат, аб'ект, на які накіравана дзеянне суб'екта, і іншыя акалічнасці дзеяння (У. Анікін, Н. Вядзернікава, Н. Крынічная, У. Кляус, Л. Парпулава, Н. Чарняева).

Праблема тэрміналагічнага вызначэння паняцця «матыў» з'яўляецца адной з найбольш актуальных, у тым ліку і пры вывучэнні твораў замоўнага жанру. Матыў – гэта неабходная катэгорыя для асэнсавання замоўных сюжэтаў. Прыняўшы да ўвагі тэарэтычныя канцэпцыі расійскіх даследчыкаў, прымяніўшы да беларускага замоўнага ўніверсума структурна-функцыянальны аналіз, можна прапанаваць наступнае азначэнне катэгорыі «матыў» у замоўным жанры: замоўны матыў – змястоўная, семантычна завершаная адзінка тэксту, элемент, які выконвае сюжэта- (утварае комплекс узаемазвязаных і ўзаемаабумоўленых матываў. Пад гэтым комплексам матываў разумеецца сюжэт) і структураўтваральную (утварае пэўныя кампазіцыйныя часткі твора) функцыі. Матыў як адносна самастойны фрагмент твора мае пэўную структуру (суб'ект, яго дзеянне, аб'ект, на які

накіравана дзеянне суб’екта, і іншыя акалічнасці), кампаненты якой выяўляюць здольнасць да дэталізацыі, чым і абумоўлена ступень канкрэтызацыі матыву на ўзроўнях субматыву (канкрэтнай рэалізацыі матыву на суб’ектным, прэдыкатным, аб’ектным або акалічнасным сэнсавых узроўнях) і мікраматыву (вышэйшай ступені канкрэтызацыі субматыву на тых жа або іншых сэнсавых узроўнях).

Студэнтам прапануецца схема аналізу замоўных матываў, з якой можна плённа працаваць і на практычных занятках:

– вызначэнне функцыянальнай ролі матыву ў замоўным тэксце;

– вызначэнне рысаў асобных структурных кампанентаў матыву (канстантнасць, імпліцытнасць);

– характарыстыка структурных кампанентаў матыву:

- суб’екта (улічваючы яго іпастась, функцыянальную скіраванасць);
- дзеяння суб’екта (пазітыўнае, негатыўнае);
- аб’екта, на які накіраваны дзеянні суб’екта;
- акалічнасцей дзеяння (у першую чаргу ў дачыненні да міфалагічных уяўленняў, якія прысутнічаюць у гэтым структурным кампаненце).

Напрыканцы заняткаў, калі ўвага студэнтаў значна зніжаецца, варта з выкарыстаннем мультымедыйнай тэхнікі прадэманстраваць архіўныя матэрыялы (пры наяўнасці такіх у фондах архіва), якія пазнаёмяць першакурснікаў з асаблівасцямі працэсу работы над запісам тэкстаў замоўнага жанру. Нялішнім будзе і зварот да ўласнага вопыту студэнтаў, якія, магчыма, былі або сведкамі практычнага выкарыстання замоў, або непасрэднымі ўдзельнікамі магічнага рытуалу.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Барташэвіч, Г. А.* Магічнае слова: Вопыт дaслед. светапогляд. і маст. асновы замоў / Г. А. Барташэвіч. – Мінск, 1990.

2. *Богданович, А. Е.* Пережитки древняго миросозерцания у белоруссовъ: этнографический очерк / А. Е. Богданович. – Гродна, 1895.

3. *Ветухов, А.* Заговоры, заклинания, обереги и другие виды народного врачевания, основанные на вере в силу слова. (Из истории мысли) / А. Ветухов. Вып. I–II. – Варшава, 1907.

4. *Добровольский, В. Н.* Смоленский этнографический сборник / В. Н. Добровольский. – С.-Петербург, 1891. Ч. 1.

5. *Романов, Е. Р.* Белорусский сборник. Вып. 5. Заговоры, апокрифы и духовные стихи / Е. Р. Романов. – Витебск, 1891.

6. *Шейн, П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения северо-западного края: в 3-х т. / П. В. Шейн. – Санкт-Петербург. Т. 1. 1887; Т. 2. 1893.